Ніва

ТЫДНЕВІК БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА

№ 47 (1082) БЕЛАСТОК 21 ЛІСТАПАДА 1976 г. ЦАНА 60 гр.

* * *

Мой бераг родны
гэтая рака
Люляла — цешыла і калыхала,
І добрай вёскі цёплая шчака
Да хваляў лашчылася закахана.

На ўсё жыццё займела я радню,
З якою
да людзей прыйсці не сорам:
Мяне вучыла яснасці
прастора,
Рака
мне даручала глыбіню.

І некалі, ўжо на астатку сіл,
Сюды б не чайкай мне па-над
вадою —
ў сваю раку
хачу я увайсці,
Навекі плынню ўліўшыся
жывою.

Любоў Тарасюк

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-76

Папулярны ў нашым асяроддзі дзявочы калектыў з Плёсак. Ён паспяхова выступіў і на сёлетнім цэнтральным аглядзе. *Фота Я. Цялушэцкага.*

НА ВІДНЫМ МЕСЦЫ

Калі вы прыбываеце ў тую частку Цеханоўца, якую тутэйшыя людзі завуць Навадворамі, сустракае вас незвычайнае суседства: алябастравай белізны вялікапанскі палац, акружаны саламянымі стрэхамі сялянскіх хат, хляўчукоў, клунькаў, свіронкаў, манежаў, абарогаў і іншых вясковых збудаванняў. Калі на сіметрычна размешчаных перад палацам клумбах красуюцца кіпарысы, лілії, ружы, дык за шчыкецікамі агародчыкаў перад хатамі цвітуць мальвы, сланечнікі, бабіна лета. І бадай нават у самых жудасных снах не явілася Кішкам, Асалінскім, Ябланоўскім, Цяцерскім ды іншым там „шляхетнанароджаным“ уладальнікам Цеханоўца і палаца, што пад іх вокнамі, у палацовым парку стане „халопскае“ сяло, а ў іхніх, абстаўленых залачонай мэбляй і крышталямі, абабітых бракатамі і атласамі, высланых персідскімі дыванамі ды прасякнутых французскімі парфумамі пакоях будуць красавацца свінячыя карыты ды шафлікі, вілы да гною, сярпы, косы, граблі ды іншыя сельскагаспадарчыя прылады, якіх паны ніколі не датыкаліся і пагарджалі цэлаю душой, як усім тым, што было „ад племя смердзя“, „ад мужыка“, „з вёхі“. Так вось на нашых вачах прывабнасці і раскошы вялікапанскіх палацаў, як прымітыўнасць і галеча простага народу адначасова адышлі з жыцця і трапілі ў музеі на вечны спачын ды павучэнне наступным пакаленням. Ну, і цікавыя ж нашыя часы!..

Такія разважанні лунаюць па маёй галаве, калі я знаёмлюся з багатымі зборамі цеханавецкага Музея сельскай гаспадаркі імя К. Клюка ды хаджу па акружаючаму яго адмысловаму скансену. І ў музеі і ў скансене знаходжу якраз тое, што найбольш мне блізкае — матэрыялы з усходняй Беласточчыны.

— Экспанаты з абшару Беластоцкага ваяводства, дзе пражывае беларускае насельніцтва, займаюць у нас віднае месца, — заўважае кіраўнік скансена мгр. **Тамаш Чарвінскі,** выхаванак аддзялення этнаграфіі на факультэце гісторыі Варшаўскага універсітэта, чалавек цалкам адданы народнаму будаўніцтву. — Па-першае, у нас знаходзіцца каля 600 экспанатаў са збораў былога Беларускага этнаграфічнага музея ў Белавежы. Мы іх вельмі старанна закансервавалі ад знішчэння і забяспечылі поўнай навуковай дакументацыяй. Па-другое, у выніку некалькігадовай збіральніцкай дзейнасці працаўнікоў музея, у ім знаходзіцца яшчэ звыш 500 экспанатаў з усходняй Беласточчыны. Па-трэцяе, у скансене мы маем два выдатныя аб'екты з тых жа ваколіц: сялянскую хату з вёскі Сакі каля Бельска і кузню з Ялоўкі. Кузня ўжо поўнасцю абсталявана ва ўсе прылады і ў ёй нават „працуе“ сапраўдны каваль, а хату мы якраз абсталёўваем.

І вось я каля беларускай хаты. Па праўдзе гэта амаль цэлы комплекс падляшскай сялянскай сялібы пад адной страхою: аднаізбовая жылая частка, се-

(Працяг на стар. 4)

У Ніны Цыванюк

Ніну Цыванюк перш за ўсё ведаем як выдатную ўдзельніцу гарадоцкага харавога калектыву. Гэта аднак знаёмства аднабаковае.

Сталовая, якой зараз кіруе Ніна Цыванюк, знаходзіцца побач з гарадоцкім трыкатажным прадпрыемствам „Каро“. Яно яе пабудавала і абсталявала, а затым, быццам святочны гасцінец, перадало ў карыстанне гарадоцкаму ГС-у. У замен сталовая, гаворачы афіцыйным жаргонам, выконвае паслугі для рабочых „Каро“.

Чыста тут, утульна, быццам дома. Усё на сваім месцы, на сталах белыя, свежыя абрусы, з кухні плыве прыемны арамат падрыхтоўваемых страў.

— Чысціня і парадак у мяне на першым месцы, — з гонарам заяўляе Ніна Цыванюк, а праз хвіліну дадае:

— Наш персанал прывучаны да гэтага яшчэ ў школе, бо мае сяброўкі па працы — выдатныя знаткі сваёй прафесіі. Шэф кухні і гармажор — закончылі гастранамічны тэхнікум, дзве іх памочніцы — прафесіянальную школу, а кухарка Оля Кулеша магла б рыхтаваць абеды нават для міністраў...

— А колькі ў вас каштуе абед?

— Рабочыя „Каро“, якія ў нас купляюць пастаянныя месячныя абанементы, **плоцяць за абед 10 зл. І гэта наша норма. Нельга нам спатрэбіць больш харчовых прадуктаў для нарыхтоўкі аднаго абеда, як на 10 злотых.** „Каро“ даплачвае, што праўда, да кожнага абеда яшчэ 4 зл. і 29 грошай, аднак і гэтая сума прызначаецца выключна на аплату рабочай сілы і абсталявання, а ў ніякім выпадку на прадукты.

Дык звяртаюся да кіраўніка гарадоцкай трыкатажкі, да Анатоля Кандрусіка, каб ён ацаніў гэтыя абеды па 10 злотых, якія рыхтуюць падуладныя Ніны Цыванюк для калектыву яго прадпрыемства.

— Гэтымі абедамі пастаянна карыстаецца ў нас звыш 100 чалавек. Я таксама часта заходжу сюды, вось як сёння, каб паабедаць. Шчыра кажучы, гэта сталовая для тых, хто хоча танна і добра пад'есці. За такую цану тут зусім добрыя абеды.

Кіраўнік Кандрусік і сама Ніна Цыванюк не сказалі мне ўсёй праўды. Аднак і без іх я ведаю, як цяжка нарыхтаваць абед за дзесяць злотых. Дык шэфу па кухні Марысі Чаламей і самой Ніне Цыванюк прыходзіцца нямала пакруціць галавой, паездзіць і пахадзіць, каб атрымаць тое, што трэба.

— А што вы думаеце? — гаворыць Ніна Цыванюк. — Рабочага трэба ж накарміць. Зараз пачнуцца зімовыя халады, а тады мы апрача звычайных абедаў рыхтуем у дзень яшчэ па 300-350 спецыяльных гарачых супоў для падсілкавання гэтых рабочых, якія вымушаны працаваць на холадзе...

— Пры кожнай сталовай заўсёды застаецца шмат харчовых адпадкаў...

— Я разумею, пра што вы — спыніла мяне Ніна Цыванюк. — На аснове таго, што астаецца ў нашай сталовай, маглі б мы выкарміць чатырох парсючкоў...

У яе ў гэтай справе ёсць ужо ўласны вопыт. Раней яна была кіраўнічкай гарадоцкай гасподы і там наладзіла адкорм свіней, выкарыстоўваючы дзеля гэтага харчовыя адпадкі. 10-12 кормнікаў у год выходзіла з яе тучарні. Праўленне ГС-у, на жаль, мала цікавілася гэтай справай. Неаднойчы Ніне Цыванюк даводзілася самой цягаць вёдры з адпадкамі, каб накарміць свіней. А калі яна адышла з гасподы, дык гадоўля занепала зусім. А гэта ж адзіны выхад, каб папоўніць пастаўкі харчовай сыравіны для падрыхтоўкі абедаў у сталовых. Тады ў кніжцы запісаў, якую вядзе сталоўка Ніны Цыванюк, паявіцца яшчэ больш падзяк і пахвал за добрую ежу, за спагадлівасць і ветлівасць.

Віктар Рудчык

Фота Я. Цялушэцкага.

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „НІВЕ“

ШТО НОВАГА?

У палоне забабонаў

Вялікія прыбыткі ад продажу нафты дазваляюць Саўдаўскай Аравіі хутка развіваць сваю эканоміку, ствараць сучасную капіталістычную прамысловасць. Аднак прагрэс у галіне эканомікі ўступае ва ўсё большае супярэчанне з векавымі асновамі мусульманскага грамадства. Гэта праяўляецца, у прыватнасці, ў нераўнапраўным становішчы жанчын у сям'і і грамадстве.

У апошнія гады ў Саўдаўскай Аравіі пачынае адчувацца недахоп рабочай сілы. Палову насельніцтва складаюць жанчыны, і было б натуральна звярнуцца да выкарыстання іх працы, хоць бы ў сферы абслугоўвання. Аднак нават сціплыя спробы жанчын прыняць удзел у грамадскай вытворчасці выклікаюць буру абурэння сярод прыхільнікаў старых парадкаў. Прадстаўніцам слабога полу да гэтага часу забараняецца вадзіць аўтамабіль. Нядаўна ў адной з праграм дзяржаўнага тэлебачання выступіла жанчына, што выклікала буру пратэстаў. Як яна магла з'явіцца на экране з адкрытым тварам!

Навучанне ў Саўдаўскай Аравіі строга раздзельнае. Ва універсітэце ў Джыдзе вучацца як мужчыны, так і жанчыны, але маладыя людзі займаюцца раніцай, а дзяўчаты ў другой палове дня. Выкладчыкам-мужчынам не дазваляецца знаходзіцца ў адной аўдыторыі са студэнтамі. Лекцыі яны чытаюць па тэлебачанню. З 5000 грамадзян Саўдаўскай Аравіі, якія вучацца за мяжой, 95 працэнтаў складаюць мужчыны.

Становішча жанчын у сям'і засталося такім жа, як шмат стагоддзяў назад. У шлюб уступаюць толькі па дамоўленасці паміж бацькамі. Многія мужчыны на пытанне, колькі ў іх дзяцей, называюць толькі колькасць сыноў. Хоць чадра паступова адступае, ні адна жанчына не адважыцца з'явіцца ў грамадскім месцы без „абаі" — прасторнай цёмнай накідкі, якая накрывае яе з галавы да ног.

Але і ў такім выглядзе жанчына можа рашыцца на гэта толькі ў тым выпадку, калі яе суправаджае мужчына.

І ўсё ж развіццё капіталістычнай вытворчасці паступова ламае ўстаноўленыя нормы грамадскіх паводзін і маралі. Пасля смерці караля Фейсала ў мінулым годзе наследны прынц Фахд дазволіў прымаць жанчын на работу ў дзяржаўныя ўстановы („калі гэта не выклікае ўскладненняў"). У выніку некалькі жанчын былі „паціху" прыняты на работу ў дзяржаўны атэль „Інтэркантыненталь" і на тэлебачанне. Пачалі браць жанчын і на прадпрыемствы АРАМКА — буйнейшай нафтавай кампаніі — у Дхаране.

Але гэта адзінкавыя выпадкі. Пераважная большасць жанчын і не думае аб уладкаванні на работу, баючыся, што гэта наклікае на сям'ю знявагу.

В. Ваўкадаў

Во, сенсацыя!

Французская газета з сімвалічнай назвай „Эндэпандан", што азначае „Незалежны", нядаўна выказала ці то спачуванне Злучаным Штатам Амерыкі, ці то абурылася горкай сенсацыяй. Яна паведаміла, што з кожных пяці грамадзян у ЗША — адзін непісьменны.

Спасылаючыся на прафесара Нортката, газета зазначае, што амерыканскія школы не даюць вучням неабходных ведаў для чытання, пісьма і ліку. Асабліва дрэнна гэтая справа абстаіць з грамадзянамі пуэрта-рыкскага і мексіканскага паходжання. З чарнаскурымі амерыканцамі таксама не лепш: тут 44 працэнты непісьменных. Абнародаваўшы такую сенсацыю, французская газета паставіла на сваіх старонках сумнае пытанне: „Хто б мог падумаць?" і сапраўды, хто б мог падумаць, што ў краіне „роўнасці" і „свабоды" столькі непісьменных людзей?



Галоўны корпус інстытута. *Фота У. Казлова.*

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З ГРОДНА

ГРОДЗЕНСКІ МЕДЫЦЫНСКІ

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут быў адкрыты ў 1958 годзе.

Сёння ў інстытуце займаюцца 2375 студэнтаў і 100 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, працуе 256 прафесараў і выкладчыкаў, у ліку якіх 22 доктары і 146 кандыдатаў навук.

За час свайго існавання інстытут падрыхтаваў 3516 урачоў, у тым ліку 1767 за гады дзевятай пяцігодкі (1971-1975 г.г.) Многія выпускнікі зарэкамендавалі сябе не толькі высокакваліфікаванымі спецыялістамі, але і добрымі кіраўнікамі медыцынскіх устаноў, 52 з іх працуюць выкладчыкамі ў гродзенскім ініінстытуце, а 29 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

За мінулую пяцігодку выкладчыкамі інстытута было абаронена 20 доктарскіх і 44 кандыдацкія дысертацыі, надрукавана 1676 артыкулаў і 17 манаграфій. Да навуковай працы прыцягнута вялікая колькасць урачоў-практыкаў. Дасягненні навукі актыўна ўводзяцца ў практыку аховы здароўя. Так, напрыклад, атрымала шырокае прымяненне ў лячэбных установах вобласці і рэспублікі распрацаванае ў інстытуце лячэнне язвы жалудачна-кішэчнага тракта растворамі дэкстрана — прэпаратамі палісахарыднай прыроды.

137 чалавек прафесарска-выкладчыцкага састава працуе непасрэдна ў бальніцах, сярод іх 14 дактароў і 85 кандыдатаў навук. Цесная работа з органамі практычнай аховы здароўя дае добрыя вынікі. Так, напрыклад, у апошнія гады ў Гродзенскай вобласці значна знізілася колькасць хворых на многія інфекцыйныя захворванні, туберкулёз і г.д.

Калектыў інстытута прысвячае вялікую ўвагу ўвядзенню элементаў навукова-даследчай работы студэнтаў у вучэбны працэс, павышэнню якасці навуковых студэнцкіх работ.

Кожны студэнт за час вучобы выконвае мінімум адну навуковую працу, якія дакладваюцца як на інстытуцкіх, так і міжінстытуцкіх рэспубліканскіх і ўсесаюзных канферэнцыях, друкуюцца ў зборніках навуковых работ і журналах. Толькі па грамадскіх навуках за мінулую пяцігодку ў інстытуце праведзена 15 навукова-студэнцкіх канферэнцый. З кожным годам расце колькасць работ, якія на рэспубліканскім конкурсе адносяцца да I катэгорыі.

У кастрычніку 1975 года ў інстытуце паспяхова прайшла аб'яднаная навуковая студэнцкая канферэнцыя медыцынскіх вузаў БССР і прыбалтыйскіх савецкіх рэспублік.

За мінулую пяцігодку выкананы план па развіццю фізкультуры і спорту, значна палепшана спартыўная база. Інстытут мае чатыры спартыўныя залы, цір, крытыя бегавыя дарожкі, будуецца спартыўна-аздараўленчы лагер і г.д.

У аглядзе-конкурсе фізкультурна-масавай і спартыўнай работы ў 1974 годзе сярод медыцынскіх вузаў СССР інстытут заняў трэцяе месца, а каманда гімнастак — першае месца на фінальных спаборніцтвах медыцынскіх вузаў СССР.

У інстытуце створаны добрыя ўмовы для студэнтаў не толькі для іх працы, але і для культурнага адпачынку. Усе студэнты забяспечаны інтэрнатам, дзе гаспадаром з'яўляюцца студэнцкія саветы.

Вялікія размахі атрымала студэнцкая мастацкая самадзейнасць. Удзельнікі самадзейнасці выступаюць на сваіх вечарах адпачынку, аглядах як у інстытуце, так і за яго межамі.

Больш 700 студэнтаў займаецца ва універсітэце культуры, які адыгрывае вялікую ролю ў эстэтычным выхаванні студэнтаў.

У 1975 годзе ўведзены ў эксплуатацыю галоўны корпус інстытута. У ім, акрамя памяшканняў для кафедраў, знаходзіцца блок паточных аўдыторый на 1100 месц, актавая зала на 700 месц, спартыўная зала, крытыя бегавыя дарожкі, бібліятэка і студэнцкая сталовая.

У дзесятай пяцігодцы (1976-1980 г.г.) значна палепшыцца матэрыяльная база большасці клінічных кафедраў за кошт будаўніцтва дзевяціпавярховага хірургічнага корпуса пры Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы, 300-ложкавага корпуса пры I гарадской клінічнай бальніцы і новага радзільнага дома.

Калектыў інстытута натхнёны рашэннямі XXV з'езду КПСС, вырашыў у дзесятай пяцігодцы змагацца за ператварэнне інстытута ва ўзорную вышэйшую навучальную ўстанову.

Д. Маслакоў,
рэктар інстытута, прафесар.

Кансультацыя ЮРЫСТА

ПЫТАННЕ: Сяліба з будынкамі з'яўляецца ўласнасцю двух братоў. Адзін з іх пераехаў у горад і хоча пазбыцца свайго ўдзелу. Другі брат мае гаспадарку 3 га. Яму ўжо 54 гады і ён не згаджаецца сплаціць грошы свайму брату, тлумачачы, што яму непатрэбныя будынкі, з якіх карыстаўся яго брат, і ён не мае чым сплачваць брату, бо даходы з яго гаспадаркі ледзь хапаюць на пражыццё, і ён не згаджаецца на тое, каб за сваю частку атрымаць сплату, бо страціў бы магчымасць гаспадарыць. Брат, які выехаў у горад, хацеў бы прадаць свой удзел у супольнай уласнасці, але хаця ёсць такія, што ахвотна купілі б цэлую сялібу, не хочуць купляць яго ўдзелу ў супольнай гаспадарцы. Як мог бы гэту справу вырашыць суд?

АДКАЗ: Можна звярнуцца да суда з патрабаваннем адмены супольнай уласнасці сялібы. Справа была б простай, калі б сялібу можна было падзяліць на дзве. Больш складанай будзе сітуацыя, калі сяліба не можа быць падзелена на дзве. У гэтым выпадку суд мог бы прыдзяліць сялібу брату, які на ёй пражывае і займаецца сельскай гаспадаркай, а таму, што ў горадзе, прысудзіць сплату. Але калі брат, што мае сельскую гаспадарку, на гэта не згодзіцца і дакажа, што не мае магчымасці сплачваць брату, узнікне сітуацыя, якую суд можа вырашыць, адмаўляючы ў падзеле сялібы. Суд не зможа пазбавіць сялібы гаспадара, які на ёй пражывае. Таму не зможа прыдзяліць цэлую сялібу брату, што пражывае ў горадзе, і не можа загадаць прадаць сялібу ў ліцытацыі, а іншых спосабаў падзелу няма.

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota — 20.XI. Techn. Rol. 6.30 RTV Szk. Śred. Mat. 8.00 Dziewczęta jak iskry — film fab. prod. TV Węg. 10.00 Dla szkół: Czerw., żółte, ziel. 11.05 Dla szkół: Geografia, kl. VIII — Zaludnienie i komunikacja USA. 13.45 Techn. Rol. J. pol. B. Prus. Lalka. 14.20 Techn. Rol. Chem. 14.50 Red. szk. zapowiada 10.05 Pr. dnia. 15.10 Radzimy rolnikom. 15.20 „5 pytań o NRD" — teleturniej. 16.00 Dla dzieci. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Sobota Młodych 18.00 Godzina Agnieszki Osieckiej. 19.00 Dobranoc. 19.30 Wieczór z dziennikiem. 20.40 Cudowny zapach forsy — film fab. prod. franc. 22.25 Dziennik. 22.40 Victoria i jej pompa — pr. rozr.

Niedziela — 21.XI. 6.45 Techn. Rol. J. pol. Bolesław Prus. 7.15 Tech. Rol. Chem. 7.45 Nasze spotkania. 8.00 Alarm przeciwpoż. trwa. 8.10 Nowocz. w domu i zagr. 8.35 Wiad. sport. 8.40 Sport dla wszystkich. 8.55 Pr. dnia. 9.00 Teleranek. 10.20 Antena. 10.45 Wielkie bitwy historii — odc. „Bitwa pod Yorktown" — film dok. prod. TV franc. 11.40 Dziennik. 11.55 Rosyjskie piosenki i pieśni ludowe. 12.25 Roln. rozmowy. 13.00 Tylko w niedzielę.

Poniedziałek — 22.XI. 12.45 RTV szk. śred. J. pol. Sztuka i lit. Oświecenia. 13.25 Techn. Rol. Przemysł. mieszanki pasz. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Zwierzyniec. 17.40 „Siedemnaście mgnień wiosny" — film ser. prod. TV ZSRR. 18.45 Studio Sport. 19.00 Dobranoc. 19.30 Wieczór z Dziennikiem. 20.40 Teatr Telewizji. Ch. E. Israll „Weteran i pani". 21.55 Studio sport. 22.45 Dziennik.

Wtorek — 23.XI. 6.00 RTV szk. śred. — J. pol. 6.30 Tech. rol. Hod. zwierz. 9.00 Dla szkół. Mat. kl. I. 10.00 Dla szkół: J. pol. kl. II lic. 10.45 „Wojna i pokój" —film ser. prod. ang. 12.55 Dla szkół: Rodz. współcz. 13.45 Tech. Rol. Mat. 14.30 Tech. Rol. Hod. zwierząt. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik 16.40 Obiektyw. 17.00 Studio Tel. Młod. 17.50 Licytacja. 17.50 Radz. rolnikom. 19.00 Dobranoc. 19.30 Wieczór z Dziennikiem. 20.40 Jutro będę płakać — film fab. prod. USA. 22.40 Dziennik.

Środa — 24.XI. 6.00 Tech. Rol. Mat. 6.30 Tech. Rol. — Hod zwierząt. 10.00 „Jutro będę płakać" — film fab. prod. USA. 12.00 Dla szkół: Wych. muz. kl. VII—VIII. 12.45 RTV szk. śred. Chemia. 13.25 Tech. Rol. Mech. rolnictwa. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dn. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.40 Los. Mał. Lotka. 17.55 Listy i polityka. 18.25 Teatr Małych Form — Jarosław Abramow-Newerly „Czy można się dosiąść". 19.00 Dobranoc. 19.30 Wieczór z Dziennikiem. 20.40 Kino Interesujących Filmów — „Iluminacja" — film fab. prod. pol. 22.15 Magda Umer przedstawia. 22.40 Dziennik.

Czwartek — 28.XI. 6.00 RTV szk. śred. Chemia. 6.30 Tech. Rol. Mech. rolnictwa. 9.00 Dla szkół: Przysposobienie obronne kl. VIII i I lic. 10.00 „Iluminacja" — film fab. prod. pol. 12.20 Decyzje piętnastolatków. 12.55 Dla szkół. J. pol. kl. I — IV lic. 13.45 Tech. Rol. Upr. rośl. 14.30 Tech. Rol. Mech. rol. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Ekran z Bratkiem. 18.00 Wróciłem — rep. film. 18.25 Piosenki Igora Słastienki. 18.50 Radz. rolnikom. 19.00 Dobranoc. 19.30 Wieczór z Dziennikiem. 20.40 „07 zgłoś się" — film ser. TVP. 21.45 Pegaz. 22.30 Dziennik.

Piątek — 26.XI. 6.00 Tech. Rol. Upr. rośl. 6.30 Tech. Rol. Mech. rolnictwa. 9.30 Film fab. 11.05 Pr. dla najmłodszych. 12.00 Dla szkół. Geografia kl. VII. 12.45 RTV szk. śred. Mat. 13.25 RTV szk. śred. Biologia. 15.50 NURT. 16.15 Pr. dnia. 16.20 Inf. Wydawn. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Pora na Telesfora. 17.30 Eureka. 18.10 „Tajemnice morza" — odc. pt. „Tropem rekinów" — film dok. 19.00 Dobranoc. 19.30 Wieczór z Dziennikiem. 20.40 W Starym Kinie — Komicy niemego ekranu. 21.05 Miłość nie jedno ma imię" — film fab. prod. NRD „Miłość 16-latków". 22.45 X Y Z cz. II.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 19.XI — 17.30 Film fab. 19.30 Jazda fig. na lodzie (z Pragi). 20.15 Koncert.
Sobota 20.XI. — 16.30 Hokej. „Dynamo" Ryga — CSKA. 19.30 Koncert.
Niedziela 21.XI. — 11.30 Film fab. 14.35 Film anim. 15.10 Panorama międzynar. 15.40 „Piosenka — 76" z Kijowa. 17.20 Film fab. 19.30 Koncert symf. 20.10 Koszykówka. „Spartak" (L) — CSKA (mężczyźni).

КІНО

Białowieża Anna Karenina — radz. 23—24. Niezwykłe przygody Włochów w Rosji — radz. 25—26 Ciepło twoich rąk — radz. 27—28.
Bielsk Podlaski Partyzanci Kowpaka — radz. 22—23. Wąwóz zapomnianych baśni — radz. 24—25. Drogi chłopiec — radz. 26—27. Trzecia córka — radz. 28.
Czeremcha Dama z pieskiem — radz. 23—24. Żenia, Żenieczka i katiusza — 27—28.
Czyże Po latach — radz. Nikt nie chciał umierać — pol. 24—28.
Dubicze Cerkiewne Los człowieka — radz. Arcymistrz — radz. 24—28.
Gródek To niemożliwe — radz. 27—28.
Hajnówka Płonąca tajga — radz. 22. Zosia — radz. 23—24. Partyzanci Kowpaka — radz. 25—26. Yuriko moja miłość — radz. 27—28.
Kleszczele Gwiazdy w morzu — radz. 23—24. Dwója z wychowania — pol. 25—26. Afonia — radz. 27—28.
Michałowo Czarownica z bagien — radz. 23—24. Gracz — radz. 25—26. Czerwony namiot — radz. 27—28.
Mielnik Bohater naszych czasów — radz. 24. Melodie z przedmieścia — radz. 27—28.
Milejczyce Szach królowej brylantów — radz. 23—24. Trzecia córka — radz. 25—26. Trudne godziny 27—28.
Narew Rzeka płynie dla zakochanych — radz. Chewsburska ballada — radz. 24—28.
Narewka Rezydent wywiadu — radz. Porucznik jazdy — radz. 24—28.
Nurzec Rezydent wywiadu — radz. 23—24. Czterdzieści minut przed świtem — radz. 25—26. Jutro przestaniesz umierać — radz. 27—28.
Orla Dzieci Don Kichota — radz. Staroświecki dramat — radz. 24—28.
Rajsk Człowiek bez paszportu — radz. Wiryneja — radz. 24—28.

B.Z.Graf. Zam. 2716 F-4

Наш каляндар

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

Пра пісьменніка, звычайна, кажуць, што ён „з'явіўся“, „увайшоў“ або „ўступіў“ у літаратуру. Пра Міхася Зарэцкага будзе больш адпаведным сказаць: ён напорыстым віхрам уварваўся ў беларускую літаратуру і сваімі творамі з месца запаланіў і чытачоў і крытыкаў.

І не выпадкова. М. Зарэцкі (сапраўднае прозвішча Міхась Касянкоў) — сын вясковага дзячка і сялянкі, нарадзіўся 20 лістапада 1901 г. у сяле Высокі Гарадзец на Віцебшчыне, вучань духоўнага вучылішча ў Оршы, затым навучэнец духоўнай семінарыі ў Магілёве, а з 1919 г. настаўнік на Магілёўшчыне і, урэшце, салдат Чырвонай Арміі з 1920 па 1927 г.г. — з вялікім талентам адлюстроўваў у сваіх творах дух часу. „Служба ў Чырвонай Арміі, — пісаў ён, — адыграла, мне здаецца, рашаючую ролю ў канчатковым фарміраванні маёй псіхалогіі. Бясконцыя блуканні з месца на месца, безліч назіранняў і ўражанняў, блізкае знаёмства з дзесяткамі і сотнямі самых разнастайных чалавечых тыпаў — усё гэта ўзбагаціла мяне невычэрпным запасам матэрыялу, які я выкарыстаў пасля ў шэрагу сваіх апавяданняў“. Першы твор адаронага пісьменніка паявіўся ў 1921 г., а праз некалькі год, бы з рога дастатку, пасыпаліся з друку зборнікі яго апавяданняў „У віры жыцця“ (1925), „Пела вясна“ (1925), „Пад сонцам“ (1926), „42 дакументы“ (1926), аповесць „Голы звер“ (1926), славуты раман „Сцежкі-дарожкі“ (1927), п'есы „Віхор на балоце“ (1928) і „Белыя ружы“ (1929). У гэтых творах ён перш за ўсё на фоне вострых супярэчнасцей жыцця, якімі была багата тадышняя рэчаіснасць, прасочвае, як рэвалюцыйныя перамены ў грамадстве ўплываюць на псіхалогію людзей і іх лёс. А ў рамане „Сцежкі-дарожкі“ перад яго галоўным героем семінарыстам Лясніцкім „Паслаліся перад вачмі бязмежныя сцежкі-дарожкі, перапляліся пераплётам заклятым — не згадаць, па якой трэба пайсці, каб патрапіць на правільны шлях“. Але пасля доўгіх і пакутлівых пошукаў і блуканняў па жыцці, азараным полымем рэвалюцыі, ён усё ж знаходзіць сваё месца ў жыцці. М. Зарэцкі быў пісьменнікам вельмі чулым на важкія грамадскія зрухі. Калі ў Беларускай ССР разгарнулася калектывізацыя сельскай гаспадаркі, з-пад яго пяра выходзяць нарысы „Падарожжа на новую зямлю“, „Лісты ад знаёмага“, „Вясна 1930 года“, у якіх знайшла адлюстраванне перабудова традыцыйнага вясковага спосабу жыцця на сацыялістычныя рэйкі. Але найбольш яркі і шматпланавы паказ гэтая тэма знайшла ў рамане „Вязьмо“ (1932) — творы, прасякнутым думкай, што перабудаваць жыццё ў вёсцы можна толькі ўшаноўваючы асобу і працу земляроба, які корміць увесь свет.

Творчасць М. Зарэцкага абарвалася ў самым росквіце яго таленту. Заўчасная смерць спасцігла яго 13 чэрвеня 1941 года. Імя ж яго ўпісалася ў гісторыю нашай літаратуры як аднаго з самых буйных яе стваральнікаў.

І. Снарскі



Жонка Браніслава Тарашкевіча, Ніна Аляксандраўна, (на першым плане) ў кутку Б. Тарашкевіча бельскага белліцэя.

НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

Была гэта пятніца 22 кастрычніка бягучага года. Здавалася б, дзень, як і ўсе іншыя дні ў школе. Урокі, перапынкі... Але ў атмасферы гэтай школьнай штодзённасці адчувалася нейкая святочная прыўзнятасць. Быццам бы некага чакалі. І вось празвінеў апошні званок, паведамляючы аб канцы школьнага дня ў беларускім ліцэі ў Бельску. Але на гэты раз ніхто не накіраваўся ў раздзявальню. Усе перайшлі ў залу фізкультурных заняткаў і, заняўшы месцы на раней падрыхтаваных лаўках, некага чакалі. **Каго?**

І раптам у дзвярах паявілася пажылая, з прыемным тварам і шчырымі вачыма жанчына. Гэта Ніна Аляксандраўна Тарашкевіч, жонка Браніслава Тарашкевіча, імя якога ад 1969 г. носіць мясцовы белліцэй. Пачулася „Добры дзень“ — і залу заліла хваля апладысментаў. У вачах Ніны Аляксандраўны паявіліся слёзы.

Яна першы раз у Польшчы. Прыехала з далёкай Масквы. І вось цяпер яна ў школе, якая носіць імя яе мужа. Ёсць чаго хвалявацца. Успомнілася мінулае, успомніліся гады, калі яны былі разам. А цяпер яна між вучняў агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання, з той мовай, якую так любіў Тарашкевіч і ў развіццё якой унёс такі вялікі ўклад. Ён жа з'яўляецца аўтарам першай беларускай граматыкі, ён пераклаў на беларускую мову „Іліяду“ і „Пана Тадэуша“, над якім даводзілася працаваць у цяжкіх умовах.

Прайшло хвіліннае хваляванне, выкліканае ўспамінам, і ўсе паселі. Пасля кароткага ўводнага слова, сказанага дырэктарам Аляксеем Карпюком, выступіў вядомы беларускі паэт Віктар Швед, які спадарожнічаў Ніне Аляксандраўне, і ў некалькіх сказах расказаў пра жыццё і дзейнасць Браніслава Тарашкевіча. Потым госцю засыпалі пытаннямі. А пасля па зале расплыліся песні школьнага дзявочага хору, які дзейнічае пад кіраўніцтвам Сяргея Лукашука. І наступіў час развітання. Зноў праз мікрафон у гучнагаварыцелі ўліўся дрыжачы ўсхваляваны голас, перадаючы шчырыя пажаданні ўсім маладым людзям, якія вучацца ў гэтай школе. Вучні памалу пачалі разыходзіцца, а мы накіраваліся на першы паверх у класа-кабінет гісторыі. На сценах партрэты заслужаных людзей. Ёсць тут і куток Браніслава Тарашкевіча. Таіса Білецкая, выкладчыца гісторыі, стараецца ўсё падрабязна тлумачыць. А калі падарожжа па „гісторыі“ было закончана, наступіў урачысты момант подпісаў у памятнай кнізе, па якой было відаць, што ўжо не адзін госць наведаў гэтую школу і гэты класа-кабінет. Позна. Час вяртацца. Але настаўнікі тут надта ж гасцінныя. Не адпусцяць так. Трэба ж чайку выпіць ды і бутэрбродам пачаставацца. Да Беластока ж далёка. Сустрэча прадаўжаецца яшчэ гадзіну. Зноў шчырая размова. І толькі тады, калі на вокны асела ноч, наступіла канчатковае развітанне. Зноў вярнулася штодзённасць, але ў сэрцы Ніны Аляксандраўны і ў сценах белліцэя сустрэча гэтая пакінула незабыўны след.

М. Шаховіч

Фота Валянціна Лапцева

Наша галерэя

Міхась Савіцкі, Мінск. „Віцебскія вароты“.

ГАВОРКІ СЛАВЯНШЧЫНЫ

Даўняя ідэя апрацавання такога выдання, якое б давала па меры магчымасці вычэрпваючае ўяўленне аб асаблівасцях усіх гаворак славянскіх народаў, у нашыя дні ўжо блізкая здзяйсненню: пры Міжнародным камітэце славістаў актыўна дзейнічае Міжнародная камісія па стварэнню **Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа.**

Пасля некалькіх год усебаковай падрыхтоўкі 11 год таму назад пачаліся працы па збіранню моўнага матэрыялу ў выбраных вучонымі 849 мясцовасцях, рассеяных па ўсёй Славяншчыне, у іх ліку 72 мясцовасцях на тэрыторыі Беларускай ССР. Ва ўсіх іх даследчыкі выяўлялі і рэгістравалі больш 2500 моўных з'яў з фанетыкі, марфалогіі, сінтаксісу і лексікі гаворак. У выніку сабрання аграмаднага матэрыялу будзе апрацавана і выдадзена звыш 2 500 картаў атласу, а кожная з іх будзе мець адначасова з факталагічным матэрыялам спецыяльны навуковы каментарый тае моўнай з'явы, якой прысвечана даная карта. Гэтыя карты будуць выходзіць паасобнымі выпускамі, прыкладна па 50 штук у кожным выпуску. Першы такі выпуск, у складзе якога 54 карты, ужо падрыхтаваны. Ён прысвечаны назвам некаторых дзікіх звяроў, птушак і іншых жывых істотаў. Варта пры гэтым заўважыць, што вучоныя-моваведы Беларускай ССР уносяць свой значны ўклад у падрыхтоўку атласу, між іншым, для першага выпуску яны падрыхтавалі 8 лінгвістычных карт з каментарыямі. Наступны выпуск карт будзе прысвечаны розным паняццям па жывёлагадоўлі і будзе падрыхтаваны ў пачатку будучага года. І тут варта прыгадаць некалькі цікавых фактаў: у розных славянскіх гаворках наша паняцце „збожжа“ мае 30 назваў, „слімак“ — аж звыш 100 назваў, а „возера“

(Працяг на стар. 4)

АДГАЛОСКІ

АДКАЗ МАЛАНЦЫ

Папалася „Ніва“
мне з самага ранка,
чытаў я шчасліва,
як паліць Маланка.
Цягнуць ці не цягнуць?
А хто яго знае,
няхай сабе цягнуць,
як ў бацькі хапае.
Судзіць я не буду,
сваіх дзяцей маю.
Пішу, што я бачыў,
і тое, што знаю.
Як быццам Маланка
аб гэтым не знае,
хто блёкі і мэблю
купляць памагае;
што вісяць каўбаскі,
аж міла глядзеці:
няхай падсыхаюць,
прыедуць мо дзеці.
Не толькі аб дзецях,
што вышлі вучыцца,
што ўспелі на вёсцы
ужо пажаніцца.
Ды ў вёсцы не мучаць
цяжкія работы,
хіба дапякаюць
якія клапоты.
Што ў лета паробіш
ад світу да змроку,
затое зімою
пралежыш на боку.
Цапы, серпы, косы
людзей не намучаць,
а пілы і жорны
маторыкі круцяць.
Пагарэ часамі,
калі хто захоча,
прыпрэ чорт з плугамі,
цягне і рагоча.
Або цяпер хочаш
граблямі махаці,
хіба табе цяжка
каня паганяці?
Гатовы снапочкі —
бяда пазбіраці?
Свішчучы ў радочкі
можна паўстаўляці.
І водпуск заўсёды
можаш сабе ўзяці,
як куды паехаць
ці то паляжаці.
А чаму ўцякаюць,
не цяжка узнаці —
самых іх жа трэба
аб гэтым спытаці.
Бо ў месце, як стане
да адной работы,
зараз прападаюць
думкі і клапоты:
што печы валяцца
(іх трэба рабіці),
да дроў трэба ўзяцца
(а сколь навазіці?).
Што, бачыш, карова
не можа сцяліцца,
што клуня старая
пачала хіліцца,
што конь захварэе
і свінні здыхаюць,
мукі есць не хочуць,
мяшанкі не маюць;
што воз ўзяў растросся
і плуг ўжо згараўся.
Як гэта наладзіў,
хамут разарваўся.
Што збожжа у полі
градам выбівае,
што дзік усё бульбу
ўначы кавырае.
А ў сена сухое
калі стане ліці,
тады пачынае
пячонка зноў гніці.
Або паліць сонца,
усё выпякае,
тады проста розум
табе высыхае.
Яшчэ жыццё, кажуць,
на вёсцы такое,
хоць маеш мільёны,
ўсяпно пахнеш гноем.
Каб мог гэта збыці
клапоты і троскі,
зноў пёр бы рабіці
да роднае вёскі.

А. Леўшук

Беларуская літаратура — Аляксандр Баршчэўскі

НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

АЛЬБЕРТ ПАЎЛОВІЧ — ЧАСТКА XXI

Гумарыстычная плынь. Феміністычны камізм. Верш „З падслуханага“ прысвяціў Паўловіч высмейванню жаночай гаварлівасці. Аўтар з трапнасцю дае замалёўку дзвюх суседак, якія загаварыліся так, што забылі аб божым свеце:

Прыйшла. Трохі адсаплася...
Сваця супраць села.
Пamaленьку далей болей
Пачалося дзела:
Круцяць, месяць і палошчуць,
Абмываюць косці,
Языкамі, як смыкамі,
Падцінаюць у злосці.
А вядома, дзе дзве бабы,
Гутарка бясконца...

Такі малюнак трэба, несумненна, залічыць да рэалістычных і верагодных. Аднак, далейшыя фрагменты твора пазбаўлены гэтай верагоднасці. Паэт, пайшоўшы на поўную эфектацыю, амаль так, як яго гераіні, забыў аб верагоднасці і рэалізме.

Да неверагодных трэба аднесці тыя часткі верша, у якіх паэт гаворыць, што адна з гераінь Лукашыха так загаварылася, што калі ёй сказалі аб пажары яе хаты, то і гэта не спыніла патоку яе пляткарскага красамоўства. Вось рэпліка Лукашыхі:

Кажа Лукашыха, —
Не дадуць адной мінуткі
Пасядзець тут ціха!
Як жа гэта гарэць можа
Хата, дах ці сені.
Вось жа ключ ад хаты маю
Пры сабе ў кішэні.

Паэт выкарыстоўвае прыём гіпербалікі і дзякуючы яму атрымлівае знешне камічны эфект.

У вершы „Маладая гаспадынька“ выступае асуджэнне жаночай ляноты. Пасля прачытання твора не маем сумнення, што ўжо ў слове „гаспадынька“ праяўляюцца іранічныя адносіны аўтара да сваёй гераіні. Гаспадыня ніяк не можа знайсці часу для работы. Перашкаджае ёй у гэтым: пагода, камары, дрымота, гульні з суседзямі або суседкамі. Верш гэты, хаця і завостраны ў малюнку рэчаіснасці, належыць да рэалістычных ілюстрацый літаратурных сродкаў.

Пазнаёміўшыся з усімі гумарыстычнымі вершамі Паўловіча, прысвечанымі жанчынам, хочацца падкрэсліць, што на іх падставе можам гаварыць аб наяўнасці пэўнага антыфеміністычнага настрою. Зразумела, што гумарыстычная паэзія заўсёды мусіць штосьці ці касьці высмейваць або абсуджаць. З гэтай прычыны антыфеміністычны матыў у паэзіі Паўловіча не сведчыць аб нейкай спецыяльнай абсесіі паэта, а толькі пацвярджае агульны характар яго гумарыстычнай творчасці.

У феміністычных гумарыстычных творах Паўловіча выступаюць тыя ж пагрэшнасці, якія характэрныя для ўсіх камічных вершаў пісьменніка. Празмерная гіпербалічная завостранасць, крайнасць, неверагоднасць — гэта частыя госці многіх камічных вершаў паэта. З другога, аднак, боку трэба сказаць, што без завостранасці, празмернай яскравасці, перабольшвання камічная паэзія амаль ніколі не абыходзіцца.

(Працяг са стар. 3)

ГАВОРКІ СЛАВЯНШЧЫНЫ

— больш 150 розных гукавых абліччаў (розных па асаблівасцях гукаў і націскаў), нашая ж пачцівая „бульба“ носіць такія назвы: „картофля“, „бульба“, „картофь“, „картоха“, „карчоха“, „картофка“, „картошка“, „кртоля“, „кртуля“, „бульба“, „бульма“, „брамбора“, „брамбор“, „пантуфка“, „бандурка“, „мандзбурка“, „бандор“, „крумпель“, „крумпля“, „крумпір“, „комбара“, „грумбір“, „груля“, „груль“, „барабоія“, „барабой“, „земка“, „земяк“, „репа“, „репіца“, „эртэпля“, „швабка“, „берна“, „кобзоль“, „ярко“, „патата“, „пірка“, „боб“, „грушка“, „кнэпель“, „кулка“, „гайдак“ і шэраг іншых. Багата, нічога не скажаш!..

Агульнаславянскі лінгвістычны атлас дасць магчымасць лінгвістам, гісторыкам і этнографам разгадаць многія генетычныя і гістарычныя таямніцы славян, якія да гэтай пары асталіся нераскрытымі.

Апрац. — іс.

НА ПРАКТЫЦЫ Ў ЛІЦЭІ

Тамара Гаворка з Кашалёў, Аня Казак з Агароднік, Надзя Панасюк з Піліпак, Аня Ляшкевіч з Красноўсі, Рэгіна Анішчук з Староўсі, Вера Тымафеюк з Сапава (з былых Гайнаўскага і Бельскага паветаў) усе яны закончылі Бельскі беларускі ліцэй ў 1972 годзе. У тым жа самым годзе прыняты былі яны на беларускую філалогію Варшаўскага універсітэта. Споўнілася адна з вялікіх іх мараў — яны сталі студэнтамі і распачалі новую старонку свайго жыцця.

Універсітэцкія заняткі, жыццё ў „акадэміку“, у студэнцкім калектыве — усё гэта хутка прыжылося і наогул праходзіла цікава і працавіта.

І вось яны, студэнты пятага курса, нядаўна закончылі практыку ў сярэдніх школах. Адны праходзілі яе ў былым сваім ліцэі ў Бельску, а другія ў беларускім ліцэі ў Гайнаўцы.

У беларускім ліцэі ў Бельску спаткаліся мы з Тамарай Гаворка, Аняй Казак і Надзяй Панасюк (глядзі фота). Расказалі яны нам аб тым, з якім вялікім хваляваннем прыступалі да вядзення першых урокаў. Тэарэтычна ведалі яны многа. Ведалі, што ў калектыве неабходна бачыць кожнага вучня і разумець яго, што нельга абражаць годнасці вучня, гонару чалавека, бо гэта зусім не развівае творчых яго здольнасцей, але наадварот, знеахвочвае да вучобы.

Бывалі яны на ўроках, якія вялі настаўнікі ліцэя, і мелі магчымасць пераканацца ў тым, што ў кожнага настаўніка свае педагагічныя прыёмы і метады вядзення заняткаў. І асабліва прыемна было быць на ўроках тых педагогаў, у якіх мова яркая, выразная, эмацыянальная, якія па-майстэрску ўмеюць зацікавіць праграмным матэрыялам. Напэўна слушна многія гавораць аб тым, што якія б не былі дасканалыя праграмы і падручнікі, найбольш залежыць ад настаўнікаў.

Тамара Гаворка вельмі хацела б вярнуцца на Беласточчыну і працаваць у школе, у якой вывучаецца беларуская мова. І гэта вельмі добра, калі чалавек любіць сваю прафесію, бо інакш бяда і яму і навучэнцам. Тамара Гаворка — будучы педагог-мовавед.

Надзю Панасюк праследуе думка аб навуковай працы. Жадаем удачы. А ў Ані Казак цікавыя жыццёвыя абставіны. Яна ўжо выйшла замуж. Будзе працаваць на Шлёнску і выкладаць у школе рускую мову, таму, што апрача беларускай мовы атрымоўваюць яны ва універсітэце таксама кваліфікацыю і выкладчыка рускай мовы.

Але пакуль што трэба ўзяцца за дыпломныя работы, напісаць іх і абараніць. І яны паспяхова абароняць іх, у гэтым, здаецца, не трэба сумнявацца.

Тэкст і фота **Міхася Хмялеўскага**

Пра паслугі ў Гарадку

Праўленне гміннага кааператыва ў Гарадку многа ўвагі ўдзяляе паслугам у сваёй гміне ды не толькі ў сваёй. У гэтым годзе адкрыла яно прадпрыемства электрычных інсталяцый — у месяцы маі, шклярскае — у кастрычніку і дыягнастычную станцыю аўтамашын і трактараў — у верасні.

З найбольшым размахам працуе аднак кавальска-слёсарскае прадпрыемства. Рабочыя гэтага прадпрыемства рамантуюць трактары, самаходы, прычэпы, шматлікія сельскагаспадарчыя машыны і прылады. Тут на месцы можна таксама скарыстаць з вулканізацыйных паслуг, а таксама зарадзіць акумулятар. З паслуг гарадоцкіх аўтамеханікаў карыстаюць і ўласнікі асабовых машын не толькі з ваколіцы, але нават з Беластока. Для іх гэта вялікая выгада. Ды й хваляць яны работнікаў за спраўную дзейсную дапамогу.

Варта дадаць, што пры пабудове памяшкання кавальска-слёсарскага прадпрыемства многа працавалі грамадскім чынам самі рабочыя на чале з кіраўніком Яўгенам Маеўскім. Іх грамадскі пачын ацэньваецца ў 250 тысяч злотых. За мінулыя дзевяць месяцаў гэтага года гарадоцкае кавальска-слёсарскага прадпрыемства зрабіла паслуг на 1 450 тысяч злотых. (ця)

Дабіліся выдатных поспехаў

Пякарня гміннага кааператыва ў Нараўцы не толькі выконвае, але і перавыконвае свае планавыя заданні. Яна перавыканала таксама свой прадукцыйны план за мінулыя дзевяць месяцаў гэтага года. Спякла дадаткова 42 тоны хлеба некалькіх гатункаў, але найбольш мазавецкага, літоўскага ды хлеба на малацэ, а таксама булачак, тортаў, пончыкаў і іншых кандытарскіх вырабаў агульнай вартасці 850 тысяч злотых.

Пякарня ў Нараўцы рассылае хлебабулачныя вырабы ў 24 прадажныя пункты ва ўласнай гміне ды ў іншыя гміны.

*

Завод газіраваных напіткаў у Нараўцы за мінулыя тры кварталы выпусціў на рынак 244 900 бутэлек аранжады, хлебнага квасу ды мандарынкі на больш чым два мільёны злотых. 95 200 бутэлек даў звыш плана (іх вартасць 236 тысяч злотых).

Напіткавытворчы завод яшчэ малады, але ўжо шырока разгарнуў сваю прадукцыю. Дзякуючы дружнай працы ўсяго жаночага рабочага калектыву ўзрастае прадукцыйнасць працы. У чацвёртым квартале нараўкаўскі завод пачне прадукаваць новы гатунак смачнага напітку — клуб-колу. (ця)

Можна і атруціцца

Адна толькі думка аб тым, каб выпіць шклянку малака, выклікае агіду ў мільёнаў людзей у Азіі, Афрыцы і Паўднёвай Амерыцы, — сцвярджаюць даследчыкі. Як выявілася, большасць насельніцтва ў гэтых частках свету лічыць малако зусім непрыгодным для ўжывання дарослымі людзьмі. У Гватэмале, напрыклад, малако выкарыстоўваюць толькі для пабелкі дамоў, а ў Нігерыі яго баяцца, лічачы, што ў ім жывуць злыя духі.

І гэта не забабоны: пасля стараннага даследавання выявілася, што ў арганізме дарослых людзей у гэтых раёнах свету адчуваецца недахоп ферментаў, неабходных для перапрацоўкі цукру ў малацэ. Утрыманне лактозы — малочнага цукру, — звычайна высокае ў дзяцінстве, рэзка зніжаецца па меры таго, як чалавек становіцца старэйшым. І дарослы чалавек, выпіўшы малако, жорстка пакутуе ад страўнікавых боляў.

Вучоныя падлічылі, што 90 працэнтаў паўднёваамерыканскіх індзейцаў і эскімосаў і 70 працэнтаў афрыканцаў маюць лактозную недастатковасць. Сярод еўрапейцаў і паўночна-амерыканцаў — толькі 20 працэнтаў людзей не могуць піць малака.

Пачатак на стар. 1

ні, камора і хлеў, не хапае толькі клунькі. Усё збудаванне адносіцца недзе да паловы мінулага стагоддзя. У хаце ўжо рэканструявана глінабітая печ, гліняны ток, палаці, стол, лавы, уся яна застаўлена хатнімі рэчамі, калаўроткам, чапялой, посудам і іншым хатнім скарбам; у сенях памесцяцца жорны, сявенькі, цэбры, ночвы, розныя кошыкі і пляцёнкі; у каморы — сундук, плецёныя ёмістасці на збожжа, муку, мяса і г.д.; у хляве — вілы, рэзгіні, вупраж. Такім чынам у беларускай сялянскай сялібе з Падляшша знойдуцца ўсе тыя рэчы са штодзённага побыту і працы нашых сялян з другой паловы XIX і першай паловы XX стагоддзяў. У асноўным гэта будуць экспанаты са збораў былага Беларускага этнаграфічнага музея ў Белавежы. Дырэктар музея — мгр **Казімір Ушынскі** сказаў, што **на інфармацыйнай табліцы каля сялібы будзе ўказана Беларускае грамадска-культурнае таварыства як арганізацыя, са збораў якой паходзяць гэтыя экспанаты.**

У колішнім палацовым парку паўстала цэлае падляшскае сяло... скансена.

НАВОШТА КІДАЦЬ У СВАЁ АКНО?

Клопаты і праблемы — гэта верны спадарожнік жыцця. Ніколі не бывае так, каб на абсеяным загоне вырасла чыстае збожжа. Заўжды паміж сяблінкамі то тут, то там паявіцца і пустазелле. Але гэта не бяда. Як крыўдна тады, калі кідаецца ў раллю высакаякаснае зерне, а на адным загоне вырастуць буйныя налітыя каласы, а на суседнім адны толькі заморышы.

З такой жа праблемай ужо пятнаццаць год змагаецца Станцыя гадоўлі і штучнага апладнення сельскагаспадарчай жывёлы ў Парослах. З 185 інсемінацыйных цэнтраў большая колькасць з'яўляецца добрымі. Прыкладамі могуць быць цэнтры ў Польку, у Ляшуках, у Луцэ, у Юшкавым Грудзе. Але добрыя яны толькі таму, што сяляне зразумелі і ўбачылі карысць, якую дае ім штучнае апладненне. Убачылі розніцу паміж каровамі і цялятамі, якіх гадуюць цяпер, а тымі, што былі раней. Хто калісьці бачыў, каб чатырохмесячнае цяля важыла звыш васьмідзесяці кілаграмаў? Сёння гэта звычайная рэч. Патрэбны толькі давер і перакананне, якіх так часта яшчэ не хапае. Заглянем у інсемінацыйны цэнтр у Козліках, што ў Заблудаўскай гміне, дзе працуе Мікалай Камінскі. Цэнтр, калі браць яго як цэласць, з'яўляецца добрым. На 600 штук гадавога плана выканана 597. Так што да канца года будзе 100%. Але калі ўзяць пад увагу паасобныя вёскі, усё набірае зусім іншых колераў. Калі з Ляшак, Рыбалаў, Давідавіч да інсемінатара каровы трапляюць амаль у 100%, то з Цялушак у бягучым годзе не было ніводнай.

Вось у пошуках прычыны і наведалі мы тую вёску, дзе згодна з падлікамі павінна быць штосьці каля 250 кароў. Лік вялікі. Куды ж тады трапляюць гэтыя каровы? Адказ вельмі просты. На вёсцы аж кішма кішыць ад патаемна трыманых бугайчыкаў, якія ў параўнанні з тымі, што ёсць на станцыі, дзе адзін важыць тысячу, а то і больш кілаграмаў, быццам бы муха супраць слана. Нічога тады дзіўнага, што сяляне ніяк не могуць развесці жывёлагадоўлю. Не могуць палюбавацца высакаякаснай пародай. Але хто ж гэтаму вінаваты, што з Цялушак апошнім часам, як нам сказалі, ніхто не змог прадаць ніводнага цяляці? Чаму? Калі прайсціся вёскаю і глянуць на хаты, амаль на кожнай страсе можна ўбачыць тэлевізійную антэну, якая гаворыць аб тым, што людзі кожны дзень спатыкаюцца з рознымі навінамі, глядзяць перадачы, бачаць, як жывуць іншыя. Чаму ж тады не могуць зразумець, што інсемінацыя ўведзена з думкай аб іхнім дабрабыце?

— Што за прычына гэтага? — звяртаемся да аднаго з жыхароў.

Пацiскае толькі плячыма і тлумачыць, што ніхто з іх не чуў пра інсемінатара. Нават і не ведалі, што ў іхнім раёне такі ёсць. А па-другое — гэта надта далёка. Але ўсё гэта толькі пустыя словы. Сам дырэктар станцыі Станіслаў Залеўскі ездзіў і паведамляў аб гэтым солтысам паасобных вёсак. Ды і адлегласць не з'яўляецца перашкодай. Хопіць толькі пазваніць, а паезд — гэта ўжо справа інсемінатара.

Нельга аднак усёй віны звальваць толькі і выключна на сялян. Як селянін можа зразумець, калі ніхто яму не пробуе тлумачыць? Трэба ж каб і сельскагаспадарчая служба правяла тут нейкую сваю дзейнасць і падказала, што патаемнае ўтрымоўванне бугайчыкаў — гэта тое самае, што кідаць каменем у сваё акно. А яна быццам бы і забыла пра Цялушкі.

— Ці прыязджае да вас аграном? — пытаем у сакратара мясцовай партыйнай арганізацыі Аляксандра Марчука.

— Не! А сходаў на гаспадарчыя тэмы вогуле не адбываецца.

Нельга ж пакінуць у цалкавітым забыцці цэлую вёску. А сяляне ў сваю чаргу таксама павінны зразумець сваю шкодніцкую дзейнасць. Чаму ж Цялушкі маюць быць горшыя ад Рыбалаў ці Ляшак?

Падобная сітуацыя і ў Канюках. Там аднак перашкодай з'яўляецца тое, што ўсе каровы ходзяць на супольным выгане. Ну, пэўна, не ўпільнуеш. Але навошта тады трымаць „дзікіх" бугайчыкаў? Час зразумець, што гэткім чынам шкодзім і сабе і суседзям.

М. Шаховіч

Весткі з Бельска

НАСТАЎНІКІ МАЮЦЬ СВОЙ ДОМ

З кожным годам у Бельску прыбывае аб'ектаў грамадскага карыстання. Нядаўна, 15 кастрычніка гэтага года, быў перададзены ў карыстанне Дом настаўніка, пабудаваны пры вялікім грамадскім удзеле педагогаў з горада і Бельскай гміны. У гэтым будынку памясцілася педагагічная бібліятэка, абшырная, светлая канферэнцыйная зала, бюровыя кабінеты, а таксама знаходзяцца тут вольныя кватэры настаўніцкіх сем'яў. Варта яшчэ дадаць, што ў бельскім Доме настаўніка, падобна як і ў гайнаўскім, знайшлося прытульнае памяшканне на каварню. А гэта не без значэння, бо ў Бельску ўсё яшчэ мала ёсць такіх аб'ектаў, дзе можна выпіць чай або каву і прыемна правесці вольны час.

(ця)

ГОНАР ГМІНЫ

Гміна Дубічы Царкоўныя налічвае дваццаць шэсць вёсак, з іх семнаццаць гэта салэцтвы. Найбольшым аднак гонарам з'яўляецца Стары Корнін. У чым жа праяўляецца заслуга гэтай вёскі?

Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба пачаць ад 1957 года. Дзякуючы дапамозе ўлад і арганізацыйным здольнасцям аднаго з жыхароў Аляксея Тамашука нарадзіўся тады ў вёсцы прадукцыйны кааператыў. Пачаткі, зразумела, былі нялёгкія. Не было дастатковай колькасці сельскагаспадарчых машын, а таксама і пераканаўных у гэтай форме гаспадарання было ўсяго дзесяць чалавек. Але дзякуючы настойлівасці ўсё памалу ўладкавалася. Прайшло дзесяць год, і няма ніякага параўнання між мінулым і сённяшнім. Зараз кааператыў налічвае 42 члены і працуе на 320 гектарах зямлі, перададзеных гмінным уладамі з дзяржаўнага фонду. Маючы за сабой зямельную і машынную базу, прадукцыйны кааператыў змог шырока разгарнуць гаспадарчую дзейнасць і дабіцца адначасова высокага ўраджаю, які дасягае 36 цэнтнераў з гектара ўсіх чатырох зерневых. Дзякуючы сваёй працы, змаглі ў гэтым годзе прадаць дзяржаве 228,5 тон збожжа, калі план гаварыў толькі аб 120. Перавыканалі яго амаль на сто працэнтаў. Апрача таго, займаюцца гадоўляй курэй. У 1975 годзе прадалі аж 110 тон курынага мяса. Але ўсё ж такі на першым месцы ставяць землеапрацоўку. На наступны год аднаго толькі жыта засеялі аж 35 гектараў. Шмат зямлі адвялі таксама і пад вырошчванне гароднінь.

Што плануюць на будучыню? У сувязі з тым, што ў бягучым годзе гмінныя ўлады перадалі далейшыя сто гектараў зямлі, члены кааператыва вырашылі выкарыстаць іх як падкладку да гадоўлі свіней. Дзеля гэтага распачалі пабудову свінарні на 1200 штук, якую закончаць у наступным годзе. А каб усё гэта асаладзіць, пачынаюць задумоўвацца над пасекай. Пчалавод ужо ёсць. Людзі тут дружныя і працавітыя, яны не любяць кідаць слоў на вецер. Так што кожная задума, ці раней, ці пазней, напэўна ажыццявіца.

М. Шаховіч

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Ганчароў М. І., Мастацтва мужнасці і гераізму, 1976, стар. 160, цана 18 зл.

Вельмі старанна і прадумана падрыхтаваная кніга-альбом па беларускаму савецкаму выяўленчаму мастацтву. Знаходзім у ім здымкі прац беларускіх савецкіх майстроў графікі, жывапісу, скульптуры.

Шлях паэта, 1975, стар. 332, цана 10 зл.

Зборнік цікавых успамінаў пра Максіма Багдановіча, сярод іх, між іншым, знаходзім артыкулы А. Багдановіча (бацькі паэта), Зм. Бядулі, З. Верас, Н. Мачульскага і іншых.

Барадулін Р., Балада Брэсцкай крэпасці, 1975, стар. 112, цана 7 зл.

Глыбокі па змесце і цікавы па навізне формы твор, прысвечаны гераізму абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў 1941 г. Побач з беларускім арыгіналам у падрыхтоўці змешчан пераклад балады на рускую мову пяра Г. Куранёва.

Гродна, 1975, цана 17 зл. 40 гр.

Прыгожы фотаальбом, у якім знаходзім некалькі дзесяткаў чорна-белых і каляровых фотаграмаў горада на Нёмане. Тэкст на беларускай, рускай, англійскай, французскай, нямецкай і польскай мовах.

Песні роднага краю, 1972, стар. 256, цана 6 зл. 80 гр.

Спеўнік, у якім знаходзім вельмі багаты выбар народных беларускіх песень, а таксама беларускіх савецкіх песень, напісаных кампазітарамі. Спеўнік склалі: заслужаныя дзеяч беларускай культуры Г. Цітовіч і Л. Траяноўская. Ён павінен знайсціся ў кожным нашым харавым і вакальна-музычным калектыве, а таксама ў дамах культуры і ў школах. Гэта ж невычэрпная крыніца песеннага рэпертуару!

Семяняка Ю., Я сэрцам з табою, 1976, цана 3 зл. 60 гр.

Зборнічак 10 песень папулярнага сучаснага беларускага савецкага кампазітара. Сярод іх „Ліст да маці", „Я тужыць не стану", „Чараўніца", „Я сэрцам з табою" і іншыя. Варта, каб зборнічак апынуўся ў руках нашых самадзейнікаў, у дамах культуры і школах.

Кнігарня ахвотна высылае кнігі за паштовым заліччэннем. Запатрабаванні накіроўвайце па адрасу:

„Dom Książki", 15-089 Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)

— Работа па абсталяванню нашага скансена па сутнасці толькі што пачалася, — расказвае Т. Чарвінскі, вядучы мяне ад аднаго аб'екту да другога. — У частцы „А" будуць знаходзіцца ўсе тыпы сялянскіх сялібаў ад найбяднейшых да самых заможных з панскім дваром уключна. Як бачыце, сялібы ўжо ёсць, не хапае нам толькі двара. У частцы „Б" будуць знаходзіцца вытворчыя збудаванні. Стаяць ужо вадзяны млын, вятрак, кузня, а прыбудзе яшчэ фолюш, алейня, комплекс свірнакаў і г.д. У далейшай будучыні ў частцы „В" стане цэлая тыповая для Падляшша вёска. Не лагічным працягам будзе дачнае сяло. Што гэта такое? Гэта будзе тыповая падляшская вёска. Яна будзе складацца са старадаўніх сялянскіх будынкаў, купленых і перавезеных сюды прыватнымі асобамі, якія хочуць мець свае арыгінальныя дачы. У хаце можна абсталяваць дасканалае жыллё, клуньку прыспасобіць на гараж, абарог ці паветку — на альтанку. Такім чынам будуць выратаваны ад знішчэння старыя арыгінальныя вясковыя будынкі і паўстануць дачы, адмысловыя. Ужо ёсць першыя ўладальнікі такіх раскошаў...

Так. Музей сельскай гаспадаркі імя К. Клюка ў Цеханоўцы з кожным годам становіцца ўсё больш вядомым у нашай краіне: штораз часцей адбываюцца ў ім навуковыя сімпозіумы, сустрэчы, канферэнцыі, расце колькасць наведвальнікаў. Маляўнічая мясціна над рэчкаю Нурэц вабіць шматлікіх адпачываючых. І вельмі добра, што і ў самым музеі і ў скансене багата прадстаўлена таксама і матэрыяльная культура беларусаў Беласточчыны.

М. Гайдук
Фота аўтара

У алябастравай бялізны сценах палаца ў Цеханоўцы цяпер памяшчаецца Музей сельскай гаспадаркі імя К. Клюка.

КАЖУЦЬ, ШТО...

„П'янаму і мора па калені", а мой знаёмы з суседняй вёскі як нап'ецца, то і ў лужыне ледзь жыцця не страціў. (мша)

ВЕР-НЕ ВЕР

Астронку! Прысніўся мне нештодзённы сон, які, думаю, павінен цябе зацікавіць. Быццам знаходжуся я ў Празе. І вось зайшла ў прадуктовы магазін і купляю хлеб. А хлеба вялікі бохан, ён пульхны, але не белы і не чорны, а такі нейкі сярэдні колер. Я пачынаю рэзаць гэты хлеб на чвэрткі (бяру ад прадаўшчыцы нож, бо думаю, што яна не ўмее дзяліць бохана так, як у нас). Плачу за хлеб, а прадаўшчыца кідае мне на прылавак цэлую жменю дробных манет. Мой кашалёк ляжыць таксама на прылаўку, бо хачу туды палажыць атрыманую рэшту. У гэты момант паяўляецца злодзей. Ён хапае мой кашалёк і ўцякае. Я за ім. Крычу: „Лавіце злодзея!“ Ён бачыць, што я яго даганяю, тады працягвае мне мой кашалёк. Я бачу, што стаіць міліцыя ці нейкія стражнікі два ў цёмных мундзірах і кажу ім, што вось злодзей, які хацеў украсці мой кашалёк. Але яны мне сказалі, што не могуць яго арыштаваць, бо не маюць ніякіх доказаў, што ён краў мой кашалёк. Прачнулася.

Галіна

Галіна! Сон ваш сапраўды можа зацікавіць. Вы былі заграніцай, а гэта ж абазначала б нейкую перамену на лепшае. Хлеб быў свежы і пульхны, дык абазначала б гэта здароўе і задавальненне, хаця і не быў ён зусім белы. Нож у вашых руках быў толькі неабходнай прыладай, каб парэзаць хлеб, так, што, думаю, вялікіх непрыемнасцей у вас не будзе. Будуць, аднак, і нікуды ад гэтага не ўцячэце, дарэмныя клопаты (дробныя манеты), пагражае вам нейкая небяспека, варожасць (вы ж бачылі злодзея). Злодзея вы ўсё ж дагналі, і ён аказаўся слабейшым за вас, дык думаю, гэтую небяспеку вы адолееце. Калі б вы не атрымалі назад свайго кашалька, азначала б гэта нейкую салідную страту.

Астрон

Сэрдэчныя тайны

Дарагое „Сэрцайка“, у кастрычніку хлопец мой пайшоў у войска. Перад адыходам бацькі зрабілі гасціну. Было шмат яго сяброў, сяброўак, сярод іх і я. І шкадую вельмі, што я тут апынулася, бо ў гэты вечар усё між намі скончылася. А яшчэ ў папярэдні дзень сядзелі мы доўга, размаўлялі аб планах на будучыню, усё было як найлепш. І вось, каб не гэты вечар... Спачатку было весела, прыемна, гутарылі, спявалі і ў пэўнай хвіліне аднаму хлопцу задумалася прынесці гітару. Ён жыў недалёка і папрасіў, каб я з ім пайшла. Мы хутка вярнуліся. Але я заўважыла, што Віця, мой хлопец, не хоча са мной гаварыць. Я вельмі здзівілася, чаго ж гэта ён пакрыўдзіўся на мяне. Што ж такое, што я на хвілінку са знаёмым хлопцам, яго сябрам, выйшла па гэтую гітару? А ён гэта прыняў як здраду. Віця сказаў, што канец з намі, калі я так пастулаю. І пры аказіі выгарнуў розныя дробязі, на якія я ўвогуле не звяртала ўвагі... Ужо ён у войску, а я вельмі сумую за ім. Шкадую, што так мы расталіся. Не напісаў ён да мяне яшчэ пісьма і не ведаю, ці адгукнецца. Сэрцайка, што рабіць, як вярнуць страчанае?..

Ася з Гайнаўшчыны

Ася! Твой хлопец празмерна зайздросны. З спраў благіх, дробных, робіць праблемы. Ён яшчэ малады, можа вырасце з гэтага. Калі кахаў ён цябе, дык з-за такой дробязі каханне яго не пагасла. Цяпер ён далёка і напэўна сумуе па табе не менш, чым ты па ім. Напішы яму сама.

Сэрцайка

МАЛА, АЛЕ ЦІКАВА

ЗААЛАГІЧНЫ УНІКУМ

У Руцаве — вёсцы, размешчанай за 50 кіламетраў ад прыморскага горада Ліепаі, 11-гадовы Айнар Вахманіс у садзе свайго дома натрапіў на заалагічны унікум — вужа з дзвюма галовамі. Загадчык аддзела музея прыроды Латвійскай ССР І. Сталбоў, на чыю апеку перададзены вуж, каменціруе гэты факт так:

— Двухгаловае — незвычайная і вельмі цікавая з'ява прыроды. На маёй памяці раней такога выпадку не было. Надзвычай цікава вывучыць узаемаадносіны двух аўтаномных цэнтраў, якія рэгулююць жыццё паўзуна, вывучыць, як уплываюць яны на характар яго паводзін і інстынкту.

Руцаўскай знаходкай, акрамя заолагаў, зацікавіліся і прадстаўнікі сумежных навук.

Куток практычных ведаў

ШЛЮБНАЯ СУКЕНКА

Набліжаецца пара найбольшай колькасці шлюбаў. Кожная дзяўчына ў духу марыць аб тым, каб у гэты дзень выглядаць цудоўна, непаўторна, так, каб усе госці анямелі ад захаплення.

Якую ж варта зрабіць сукенку? Ці простую, ці больш урачыстую, з вэлюмам ці без яго, доўгую ці кароткую?..

А ўсё ж урачыстую, хаця, здавалася б, што прастата пачала дамінаваць у нашыя часы. Як прыгожа выглядае стройная дзявочая постаць з атласнай істужкай у таліі, завязанай ззаду на вялікі аздобны бант! А як цудоўна пры гэтым выглядае вэлюм, аздоблены такімі ж кветкамі, якія трымае ў руцэ нявеста!

Вельмі прыгожа выглядаюць сукенкі ў рамантычным стылі. Нішто так не падкрэслівае маладосці і прыгажосці, як белы колер. А калі спалучыць яго з фальбанкамі, мярэжкай, далікатнай аплікацыяй, белымі карункамі...

Аб адным неабходна памятаць: матэрыял павінен быць добрага гатунку, аб ніякіх заменах не можа быць мовы.

Ну, і яшчэ адно. Каб не перасаліць! Нягледзячы на ўрачыстасць, нявеста заўсёды павінна выглядаць скромна.

Сяброўка

Камандзір і камісар вырашылі: няхай леснікі — Васіль Халецкі, браты Аляксандр і Павел Пінчукі — хваляцца перад ляснічым і паповічам, што часта сустракаюць дзікоў, няхай распальваюць у Фенса паляўнічы азарт.

Групенфюрэр клюнуў на прынаду. Для пачатку прыслаў у Машукоўскі лес свайго халуя — паповіча. Некалькі гадзін вадзілі яго па лесе Халецкі і браты Пінчукі. Леснікі гаварылі праўду: паповіч сам бачыў двух дзікоў. Пераканаўся ён і ў другой іх праўдзе — партызан у лесе не было.

Паехаў паповіч у Баранавічы, а праз два-тры дні Шатырка пацвердзіў тое, аб чым здагадваўся камандзір. У тэрміновым данясенні ён паведамляў Арлоўскаму, што ў бліжэйшую нядзелю — 14 лютага — паляваць на дзікоў у Машукоўскі лес прыедзе Фенс са світай чыноўнікаў і афіцэраў-эсэсаўцаў. На гэтым паляванні Фенс загадаў быць і яму, начальніку паліцэйскага ўчастка Мікалаю Шатырку...

Арлоўскі і Івашкевіч добра падрыхтавалі атрад, каб „горача“ сустрэць высокіх паляўнічых. Але яны не прыехалі ў нядзелю, не было іх і ў панядзелак. „Мяркуючы па ўсім, Фенс адклаў паляванне на тыдзень-два“, — паведаміў Шатырка праз Аляксандра Федаровіча. Не сядзець жа атраду без работы гэты час. Адну за другой адправіў камандзір дзве групы байцоў. Збіраўся на сустрэчу з разведчыкам Басарыновічам і камісар атрада...

● ● ●

Познім вечарам 16 лютага 1943 года прыбег у атрад Васіль Халецкі і папрасіў зараз жа разбудзіць камандзіра. Спяшаючыся, ён расказаў Арлоўскаму, што заўтра ў Мяшкоўскі лес на дзікоў прыедзе галоўны камісар Баранавіч Фенс і з ім будзе нейкі вельмі важны начальнік з Мінска. Высокіх чыноў будзе суправаджаць і ахоўваць каманда эсэсаўцаў. З Баранавіч да Сіняўкі паляўнічыя будуць дабірацца на аўтамашынах, у Сіняўцы перасядуць у сані.

Не паспеў Арлоўскі добра распытаць Халецкага пра дарогу, якой будуць ехаць фашысты і ў якіх кварталах збіраюцца паляваць, як у зямлянку ўваліўся задыханы Аляксандр Федаровіч. Ён скінуў шапку-вушанку, кажушок. Густая пара валіла ў яго з галавы, са спіны.

— Ці не чэрці за табой гналіся, Саша? — спытаў Арлоўскі.

— Горш, таварыш камандзір. Заўтра, а можа ўжо і сёння на паляванне сюды прыедзе Фенс, эсэсаўскі генерал, гебітскамісар Баранавіцкай вобласці Шцюра і... сам гаўляйтэр Кубэ.

— Кубэ, кажаш? — Арлоўскі пераглянуўся з камісарам. Каго-каго, а Кубэ яны не чакалі. — І што, яны адны, без світы прыедуць?

— Не! Мікалай прасіў перадаць, што з імі будзе каля паўсотні эсэсаўцаў.

І Васіль Сцяпанавіч Халецкі, і Аляксандр Федаровіч былі лепшымі разведчыкамі атрада, яны не раз паведамлялі „Сокалам“ вельмі важныя звесткі. І цяпер іх паведамленні супалі. Аляксандру Федаровічу, пра маючае адбыцца паляванне гітлераўцаў у Машукоўскім лесе даручыў перадаць Шатырка: па заданні Арлоўскага ён працягваў служыць у паліцыі. Халецкі ж пра паляванне даведаўся „па сакрэту“ ад Сяргея Бабко, мясцовага ляснічага, агента СД. Бабко прасіў Халецкага быць праваднікам у паляўнічых, але Васіль Сцяпанавіч спаслаўся на хваробу і паспяшаўся з навіной у лес.

Моцна задумаўся Арлоўскі. Сілы былі надта няроўныя:

— Так, задача не простая. А, Рыгор Васільевіч? — звярнуўся Арлоўскі да камісара атрада.

Па вопыце Рыгор Васільевіч ведаў, што камандзір прыняў ужо рашэнне і цяпер толькі правярае сябе. Прыняў рашэнне і камісар атрада: што б там ні было арганізаваць засаду на паляўнічых. І таму ён цвёрда адказаў:

— Кірыла Пракопавіч, выпадак, можна сказаць, асаблівы, выключны. Высокія чыны самі пруць на ражон. Наладзім паляванне на паляўнічых!

— Дзякуй, Рыгор Васільевіч. Прызнацца, іншага адказу я ад цябе і не чакаў. Ты праўду кажаш — выпадак выключны, і не скарыстаць яго нельга. Будзем сустракаць „гасцей“ па-нашаму, па-партызанску. — І камандзір загадаў сабраць байцоў.

Праз некалькі мінут байцы атрада былі ў камандзірскай зямлянцы. Дапытліва азіраючы іх, Арлоўскі расказаў пра толькі што атрыманыя дадзеныя.

Загадаўшы байцам старанна праверыць зброю, Арлоўскі адпусціў сваіх баявых сяброў, а сам разам з камісарам і Васілём Халецкім схіліўся над картай.

— Вось і Раскоп, — камандзір алоўкам паказаў на скрыжаванне лясных дарог. — Твая праўда, Васіль Сцяпанавіч: паляўнічыя ніяк не мінуць яго.

Яны намецілі маршрут падыходу да Раскопа: трэба было ісці да месца засады, мінаючы дарогі, каб не пакінуць слядоў.

— Здаецца, усё прадугледзелі, — задумліва сказаў Арлоўскі. — Але мала нас, вельмі мала... Усяго дванаццаць чалавек.

— Трынаццаць, — удакладніў Халецкі. — Хіба я не баец? — у голасе лесніка чулася крыўда.

(Працяг будзе)

ТРЫБУНА чытачоў

Прыкладны працаўнік і пакупнік—крыкун

У Беластоку на вуліцы Фабрычнай каля станцыі ПКС ёсць кіёск з каўбаскай з ражна. Там заўсёды многа людзей, пераважна падарожныя, якія прыехалі аўтобусам ў Беласток або ад'язджаюць.

Зайшоў я туды 14 кастрычніка а 12 гадз. 15 мін. Стаў у чаргу, якая хутка ішла ўперад, бо прадаўшчыца спраўна і ветліва абслужвала. Узяўшы сваю порцыю, стаў я каля століка, каб яе спакойна з'есці. У гэты час прадаўшчыца выйшла не больш, як на дзве мінуты (можа за патрэбай). У чарзе стаяла не больш дзесяці асоб. Аднаму з іх не спадабалася, што прадаўшчыца выйшла, і ён давай крычаць, што яму есці хочацца. Прадаўшчыца прыйшла і, не адказаўшы ні слова на гэты крык, давай далей працаваць. Але нехта ззаду адазваўся: „Пане, чаго так крычаць, можа ж працаўнік выйсці на мінуту, калі восем гадзін стаіць на адным месцы". Я ўцешыўся — добра, што хоць адзін заступіўся за прадаўшчыцу. Бо ёсць у нас людзі-крыкуны. А пра словы, якімі яны кідаюцца, нават сорамна пісаць.

Можа той чалавек, калі прачытае мае заўвагі ў „Ніве", падумае, што варта пайсці ў той самы кіёск з каўбаскамі і перапрасіць жанчыну за свой брыдкі і непатрэбны крык.

М. Лук'янюк

Адна і тая ж думка

Уступ рэдакцыі. Аб адным і тым жа, не згаварыўшыся, напісалі нам карэспандэнты з Бельска. Сведчыць гэта аб тым, што цікавая думка родзіцца ў Бельску, і варта зацікавіцца ёю шырэй. Чакаем, што на гэтую тэму скажа сваё слова Таварыства сяброў горада Бельска і бельскія ўлады. А вось два галасы.

*

Штораз менш у нашых сёлах старых драўляных будынкаў. Праз год-два загіне ўсё старыннае. Ці не можна было б зрабіць у Бельску скансен драўлянага будаўніцтва, звезці туды пару хат ды іншыя прылады жыцця і працы нашых

Усіх сіл трэба

У Шудзялаве адбыўся сход гміннага камітэта партыі, на якім былі абмеркаваны пастановы IV пленума ЦК. Таварышы звярталі ўвагу на той факт, што ў гміне Шудзялава ёсць многа нявыкарыстанай зямлі і балот, на якіх расце толькі асот. Праязджаючы праз гмінныя палі, бачыш, як на палях многіх вёсак ляжаць вялікія адлогі.

На гэтую ж тэму былі праведзены сходы ва ўсіх шудзялаўскіх вёсках. Гаспадары раілі, як павялічыць жывёлагадоўлю, перш за ўсё гадоўлю свіней. Гаварылі і аб цэнах. Бо цяпер, напрыклад, ячмень на рынку каштуе 600 злотых, а ячменная крупа ў краме — 4,30 і 5,70 зл. Пшаніца на рынку каштуе 600 зл., а мука ў краме 6 зл. Так быць не павінна.

Віт.

На ўсё час

Дрэнацыя лугоў і палеткаў у Тафілаўцах Дубіцкай гміны ўжо закончана. Закончылася таксама аранне амаль усіх лугоў, дзе пасеюць добрую траву. Ачысцілі і раку Арлянку.

У недалёкай будучыні вёска можа стаць прыкладам для іншых. У гэтым годзе сяляне гэтай вёскі шукалі пашы травы ў іншых вёсках і куплялі яе, бо лугі ўласныя былі заараны, але не засеяны.

М. Панфілюк

Дастаўшчык

Ужо 7 год, як Дзям'ян Чыквін — селянін з вёскі Чэхі Арлянскія возіць сваім канём і возам малако аднавяскоўцаў у бліжэйшую злеўню. Апошнія гады возіць ён у Дубічы Царкоўныя. Штодзённа дастаўляе больш 500 літраў.

Хоць вёска Чэхі Арлянскія невялікая, аднак жыхары, маючы нямала сваіх лугоў і паш, гадуюць многа кароў.

Чэхаўцы не выпадкова выбралі дастаўшчыкам Дзям'яна Чыквіна. У яго конь, як леў, прыгожы і здаровы, на ўсю вёску чуваць здалёк яго цокат, ка-

На заслужаны адпачынак

Веры Смык са Ставішчаў мінула 55 год. Пайшла ўжо на пенсію. І не было б тут нічога асаблівага, калі б не факт, што гэта жанчына працавала ў сваёй прафесіі — чыгуначнай кандуктаршай 26 год. Працу на чыгунцы ў Чаромсе пачала ў 1950 годзе і да апошняга дня сваёй службы не змяніла яе.

Была яна адзінай жанчынай у чаромхаўскіх дружынах да 1970 года. Праз нейкі час атрымала павышэнне і функцыю кіраўніка цягнікоў. Добра выконвала свае абавязкі, і як член партыі была прыкладам многім калегам.

Веру Смык праводзілі супрацоўнікі на супольным вечары ў Ставішчы. З нагоды Дня чыгуначніка была ёй прызнана ганаровая грамата і грашовая ўзнагарода.

Ад імя шырокага круга супрацоўнікаў і калег хачу пажадаць Веры Смык поспехаў у далейшым жыцці і выдатных дасягненняў у грамадскай працы.

Ул. Сідарук

Рабочы рана ўстае

У свой час „Ніва" пісала, што не зусім добра дзеецца ў гайнаўскім ВСС. Напрыклад, хлеб розных гатункаў дастаўляецца ў краму а гадз. 7 раніцы. На гэта дам прыклад крамы 43 на велізарным пасёлку ў цэнтры рабочай Гайнаўкі. Да працы вельмі многія ў рабочай Гайнаўцы прыступаюць а гадз. 7, а некаторыя ж даязджаюць яшчэ. Але булачкі ці куска хлеба а гадз. 6 не купіш, трэба чакаць да гадз. 7. І ў такім выпадку няма мовы, каб паесці і добра сябе адчуваць.

Дрэнна дзеецца і таму яшчэ, што цяпер вельмі часта ў той жа краме 43 у Гайнаўцы і пасля абеду няма хлеба. Цікава, ці пад сілу будзе гайнаўскаму ВСС уладзіць з карысцю для людзей гэтыя справы?

Крыніца

Што далей?

У сяле Піліпкі на Бельшчыне пабудавалі святліцу. Будавалі яе з гмінных сродкаў у Бельску і сяляне Піліпак

Сяляне ім не нацешацца

Уладзімір Семянюк, селянін з Дубіч Царкоўных, майстар на ўсе рукі. Ён і слесар, і каваль. У яго ўласны трактар і ўсе неабходныя машыны. Нікому не адмовіць у выкананні паслугі. Сваім аднавяскоўцам ён і арэ і сее ў сезоне, і косіць траву і жыта. У час бульбакапання Уладзімір сваёй бульбакапалкай многім сялянам капаў. У яго яна новая і вельмі добра ідзе работа.

Як ведаем, капаць бульбу добра ў добрую пагоду. Сяляне ў такі час нават мінутку часу высока цэняць. Таму Уладзімір Семянюк са сваім сынам Іванам уначы капалі людзям бульбу.

Сяляне не нацешацца гэтым чалавекам. Каб не ён, цяжка было б у нас з паслугамі, бо ў мясцовым сельгасгуртку вялікі балаган. Сюды тыдзень часу па дзесяць разоў ў дзень трэба хадзіць у бюро, каб урэшце выпрасіць бульбакапалку. А Семянюку даволі сказаць адзін раз. На старонках „Нівы" ад усіх хачу яму падзякаваць.

М. Панфілюк

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Да публікацыі: „А МАГЛО Б БЫЦЬ ПРЫГАЖЭЙ", „Ніва", № 35 (1070) ад 29 жніўня 1976 г.

Адказвае:

WOJEWÓDZKI ZWIĄZEK GMINNYCH SPÓŁDZIELNI „SAMOPOMOC CHŁOPSKA" W BIAŁYMSTOKU.

Redakcja tygodnika Białoruskiego „Niwa" w Białymstoku przesłała do t/WZGS „SCH" wycinek „Krytyka nie pomogła" dotyczący nie zagospodarowanych, nieestetycznych terenów wokół sklepów we wsi Bondary i Rybaki, a także wokół pawilonu handlowego w Michałowie przy ul. Białostockiej. W artykule tym poruszona jest sprawa nie zagospodarowanych kwietników i zieleńców przy pawilonie w Michałowie oraz braku stojaków na rowery przy sklepie w Bondarach i Rybakach.

W związku z tym zaleca się: (GS w Michałowie):

1. Zagospodarować zieleńce wokół w/w obiektów sklepowych na wiosnę 1977 r.
2. Rozważyć możliwość ustawienia stojaków rowerowych przy sklepie w Bondarach i Rybakach.

Kier. Dział OTH
(M. Tyszków)

Wiceprezes Zarządu WZGS
d/s Handlu, Gastr. i Usług

МАЛЕНЬКІ

Мне здаецца, я зусім-зусім маленькі... Можа, і двух гадкоў яшчэ няма. Нават хадзіць як след не ўмею — тэпаю, трымаючыся за сцяну. А то і паўзком-рачком рухаюся. Так нават больш зручна — не ўпадзеш, не разаб'еш нос. Вось паўзу, паўзу, пакуль не натрапілася на шляху перашкода — плот... Плачу ад роспачы, але хіба маленькі ды кволы можа пералезці цераз высокую агароджу? Хутчэй адчуваю, чым бачу: нейкая цюцька падбегла і спачувальна ліжа мне твар... Дзякуй, шчырае дзякуй табе, верны друг чалавека!

А міма ідуць дзядзькі і цёткі, пазіраюць і смяюцца. І я, выціраючы слёзы, таксама смяюся. Рагачу, аж заліваюся, бестурботна, як усе дзеці, нават жывоцік баліць ад смеху. І мне пад плотам зусім ужо добра, прыемненька гэтак: цянёк, зацішна, навакол траўка высокая, мурашачкі ды казюлькі па ёй розныя поўзаюць... А над галавой нейкае дрэва гойдаецца, шуміць, сумна так шуміць, закалыхвае: галоўка мая кружыцца, кружыцца, вочкі самі зліпаюцца, закрываюцца, спаць хочуць.

Але хіба дзядзькі могуць пакінуць маленькага аднаго без нагляду? Яны такія клапатлівыя, гэтыя дзядзькі... Лёганька, як пушынку, бяруць мяне пад пашкі і вядуць, бездапаможна. „Не чапайце мяне, — хачу сказаць ім. — Не чапайце... Хлопчыку трэба бай-бай..."

Хачу так сказаць, але нічога не атрымліваецца, акрамя мармытання: цяжка маленькаму гаварыць... Урэшце, мяне ніхто і слухаць не жадае, цягнуць у машыну і вязуць некуды. Ну няхай сабе вязуць — усё роўна.

Вось толькі калі мяне пачынаюць мыць пад душам, я пачынаю крышку ўпарціцца, капрызіць, як усе дзеці. Але дзядзькі-нянькі не звяртаюць аніякай увагі на мае капрызы, хуценька захінаюць у чыстую прасціну і кладуць у ложак. Ужо засынаючы, чую над сабой бурклівы, але ласкавы голас:

— Ну, уціхаміруйся, хлопчык... Здаецца, гэты патлаты нядаўна трапляў ужо да нас у выцвярэзнік?

Я. Іваноў

З паляўнічых прыгод .





Як абяспечыць індывідуальныя асаблівасці.

КРЭМ-НАВІНКА

Мне надоечы кузіна Зінка
(А па нашаму яно — сястра)
Самую найноўшую навінку —
Цудадзейны крэм перадала.
Кажа: „Ён прыплыў
з Пуэрта-Рыка,
З трэціх рук дасталі мне сябры.
Твар намажаш — будзеш моды
шыкам!
Ну і што, што сем рублёў? Бяры!"
Вечарам намазалася. Спала
Саладка!
І бачыла я ў сне,
Як акцёр Дэлон сярод парталаў
У каханні вечным кляўся мне.
Раніцай — да люстра.
Ажно крыкам!
І да Зінкі — біць у вокнах шкло:
Мне навінкай той
з Пуэрта-Рыка
Твар, як крапівою, апякло!
Падняліся, быццам цеста, шчокі,
Нос, бы пераспелы той тамат!
Што акцёр Дэлон! Мяне здалёку
Абягае мой сусед Ігнат!
Швагер мой той крэм узяў у рукі,
Пераклаў інструкцыю — і сеў.
Аж пішчыць ад смеху: „Гэта...
гэта
Трэба перадаць хутчэй у хлеў!
Крэм жа прызначаецца для
свінак,
Каб у іх не драцянела шчэць!"
...З дня таго я не хачу навінак
Ні з другіх, ні з трэціх рук
глядзець!

Паліна Маліна

НА ШЫРОКІМ

Сустрэлі габраўц

— Добры дзень! прыехаў?

— У вясельнае жа!

— А дзе ж няве

— Засталася ў Яна была ў Сафі гадоў назад.

*

Вартавы аклікну ка, які падыходзіў

— Я маёр Джон заў той.

— Выбачайце, сэ магу прапусціць ва цыяльнага пропуск

— Не строй дур дасканала мяне ве проста забыў пропу

Вартавы быў непа

— На жаль, сэр, я права...

З каравульні дано лас:

— Ты што, усю но ешся з ім вазіцца? П лі яго — і канец.

*

— Дык, значыць, наты ўжо трыццаць Слова гонару, ты за ваш медаля.

— Ну, калі б ты вед жонку, ты не гавар так, а адразу ўзна бы мяне крыжам з расць.

...Ён лічыў, што „Не бойцеся цяжк адносіцца толькі каатлетаў.

продкаў? Такі скансен бачыў я ў Саноку ў

лі раніцай едзе на ім Дзям'ян — сумленны і добры гаспадар, здольны каваць, хата

складаліся таксама па 200 зл. кожны. Дом паставілі